ДОБРА НА РАБОЦЕ — ДОБРА ПА ЖЫЦЦІ

Акрамя наладжаных і бяспечных умоў працы, людзям неабходныя і добрыя ўмовы жыцця. Гэта знаходзіцца ў кампетэнцыі **галоўнага спецыяліста сацыяльна-эканамічнай работы Беларускага прафсаюза работнікаў транспарту і камунікацый Алены ГІРО**. Уся дзейнасць гэтай галіны пабудавана вакол тарыфнага пагаднення — найважнейшага інструмента эфектыўнага ўзаемадзеяння наймальнікаў і прафсаюзаў. На аснове дакумента распрацоўваюцца і заключаюцца калектыўныя дагаворы ў кожнай арганізацыі галіны. Тарыфнае пагадненне паміж Міністэрствам транспарту і камунікацый і БелПрафТрансам прадугледжвае працоўныя і сацыяльна-эканамічныя гарантыі для работнікаў галіны. Дакумент складаецца з дзевяці раздзелаў. Самыя папулярныя з іх датычацца аплаты працы, сацыяльных гарантый, падтрымкі моладзі. Па словах галоўнага спецыяліста па сацыяльна-эканамічнай працы, галоўная задача гэтай сферы работы — кантроль за выкананнем гарантый, закладзеных у калектыўныя дагаворы і тарыфнае пагадненне.

«Наша тарыфнае пагадненне нават паляпшае некаторыя сацыяльныя гарантыі, якія замацаваны заканадаўствам. Напрыклад, у дачыненні да работнікаў перадпенсійнага ўзросту. У працоўным заканадаўстве сказана, што перавагу маюць людзі, якім да пенсіі засталося два і менш гадоў. А ў нашым тарыфным пагадненні ўказана, што тры гады, яно паляпшае ўмовы. У тарыфным пагадненні ёсць раздзел «павышэнне ўзроўню жыцця працаўнікоў». А высокі ўзровень жыцця — у першую чаргу добрая аплата працы. Мы не можам самі людзям плаціць зарплату, таму мы кантралюем, ці своечасова яны атрымліваюць грошы, ці правільна разлічылі пры звальненні ці адпачынку», — адзначае Алена Гіро.

Асобная катэгорыя работнікаў — маладыя спецыялісты. У галіне транспарту і камунікацый сваю кар'еру пачынаюць сотні ўчарашніх студэнтаў. Таму і падтрымка для іх асаблівая, кажа Алена Гіро: «У нашай галіне некалькі падгалін, якія значна паміж сабой адрозніваюцца, у тым ліку і фінансавымі магчымасцямі. Таму мы не можам прапісаць адзіныя для ўсіх грашовыя выплаты. Гэта закладзена ў калектыўных дагаворах кожнай падгаліны. У дачыненні да маладых спецыялістаў мы прапісалі, што будзем кампенсаваць кошт найму жылля, вучобы для павышэння кваліфікацыі, калі ўзнікае такая патрэба. У некаторых арганізацыях ёсць такое паняцце як «настаўніцтва». За маладым спецыялістам замацоўваецца супрацоўнік, які дапамагае маладому калегу зразумець увесь рабочы працэс і адаптавацца да яго. Зразумела, за гэта прадугледжаны пэўныя выплаты. Многія арганізацыі супрацоўнічаюць з профільнымі навучальнымі ўстановамі».

30 верасня адбылося пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Рэспубліканскага камітэта БелПрафТранса, дзе былі падведзеныя вынікі выканання ў першым паўгоддзі Тарыфнага пагаднення паміж Міністэрствам транспарту і камунікацый і галіновым прафсаюзам. На пасяджэнні былі агучаны лічбы сярэднямесячнай заработнай платы на прадпрыемствах галіны, аказання матэрыяльнай дапамогі работнікам. Была прадстаўлена карціна няпоўнай занятасці работнікаў у сувязі з пандэміяй каранавіруса. У асноўным з гэтай праблемай сутыкнуліся прадпрыемствы Беларускай чыгункі і часткова Нацыянальны аэрапорт.

Прававы інспектар Марыя САКАЛОВА і галоўны спецыяліст сацыяльна-эканамічнай работы Алена ГІРО.

УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ ПА ЗАКОНЕ

Каб супрацоўніцтва задавальняла і работніка, і наймальніка і было эфектыўнае, трэба выкананне юрыдычных правілаў і нормаў. За гэтым пільна назірае **прававая інспекцыя працы БелПрафТранса на чале з Вольгай ГІНЬКО**. Да іх у выпадку рознагалоссяў звяртаюцца па юрыдычную дапамогу. Галоўнай задачай прававой інспекцыі працы яна называе абарону працоўных, сацыяльна-эканамічных і жыллёвых правоў членаў прафсаюза. «Апошнім часам часцей за ўсё прыходзіцца сутыкацца з працоўнымі спрэчкамі. 28 студзеня выйшаў новы Працоўны кодэкс, было шмат змяненняў у працоўным заканадаўстве. І пакуль не хапае практыкі прымянення новых нормаў, узнікаюць спрэчкі і непаразуменні. Мы атрымліваем шмат пытанняў ад кадравых службаў нашых арганізацый, што вельмі добра. Яны цікавяцца, каб ведаць, як вырашаць важныя праблемы на месцах».

Галоўны прававы інспектар Вольга ГІНЬКО.

Самая распаўсюджаная праблема, з якой звяртаюцца да прававога інспектара працы, — абарона правоў пры звальненні. Спецыяліст аналізуе, ці правільна было афармлена звальненне, ці атрымаў работнік належныя выплаты. Пры звальненні работніка часта ўзнікаюць пытанні, вырашыць якіх можна толькі ў судзе. У гэтым выпадку прафсаюз дапамагае рыхтаваць патрэбныя дакументы, прадстаўляе ў судзе інтарэсы работніка. «Апошняя спрэчка, якую мы разглядалі, была звязана з няправільным разлікам заробку за перыяд знаходжання на курсах павышэння кваліфікацыі. А аказалася, што проста няправільна афармілі дакументацыю, і работнік сыскаў 2000 беларускіх рублёў. Мы часта вырашаем жыллёвыя пытанні. На жаль, у гэтым выпадку ніяк не пазбегнуць спрэчак. Інтэрнаты, засяленні, пастаноўка на ўлік тых, хто мае патрэбу, і выдзяленне ім жылых месцаў. Здараецца, што з-за недахопаў у дакументах чалавек аказваецца на вуліцы і наша задача дапамагчы яму ў цяжкай сітуацыі», — расказвае Вольга Гінько.

Прававая інспекцыя працы прафсаюза работнікаў транспарту і камунікацый робіць усё магчымае, каб не дапусціць вырашэння спрэчак у судзе: «Судовы працэс — гэта апошні крок, калі вырашыць пытанне мірна ўжо немагчыма. Часта ў нас атрымліваецца знайсці кампраміс, які задаволіць і работніка, і кіраўніка. На аснове звароту, з якім да нас прыходзіць заяўнік, мы робім запыт у арганізацыю альбо прававыя інспектары выязджаюць самі. І разам стараемся вырашыць гэта пытанне. Са свайго боку мы даём рэкамендацыі ці прадстаўленне аб ліквідацыі парушэнняў па тым, якія нормы былі парушаныя, і як іх выправіць. Калі кіраўнік не прымае нашы рэкамендацыі да ўвагі, па рашэнні заяўніка ён звяртаецца ў суд. Таксама мы раім заяўніку, у першую чаргу, звярнуцца ў камісію па працоўных спрэчках. Многія арганізацыі, каб не дапусціць узнікнення спрэчак, пастаянна з намі супрацоўнічаюць і кансультуюцца».

Прававая інспекцыя працы прафсаюза работнікаў транспарту і камунікацый вядзе своеасаблівую статыстыку. Цікава, што ажыятаж спрэчак прыходзіцца на восень і вясну. Дарэчы, пандэмія каранавіруса на колькасць працоўных спрэчак не паўплывала. Па словах Вольгі Гінько, зваротаў у 2020-м больш, чым у 2019 годзе, але яны не звязаныя з эпідэміялагічнай сітуацыяй.

Самая бесканфліктная катэгорыя працаўнікоў — маладыя спецыялісты. Галоўны прававы інспектар працы звяртае ўвагу, што гэта зразумела. Галіна транспарту і камунікацый не кідае сваю моладзь на волю лёсу. Арганізацыі плённа супрацоўнічаюць з універсітэтамі. Маладым спецыялістам дапамагаюць атрымаць месца ў інтэрнаце, калі ў арганізацыі яго няма, пішацца хадайніцтва на іншую арганізацыю.

Нягледзячы на розныя задачы і кампетэнцыі, тры «кіты» Беларускага прафсаюза работнікаў транспарту і камунікацый робяць агульную справу — дапамагаюць працаўнікам галіны адчуваць сябе камфортна, атрымліваць задавальненне і прэферэнцыі ад сваёй працы. Транспартная галіна з гонарам справілася з усімі цяжкасцямі гэтага года.

МАЙСТЭРСТВА ПАЦВЕРДЖАНА

Адно з самых буйных дарожных прадпрыемстваў «Мінскаўтадар-Цэнтр» правяло конкурс прафесійнага майстэрства сярод сваіх супрацоўнікаў. Сёлета спаборніцтва прайшло сёмы раз. Мэта конкурсу — з'яднанне калектываў, павышэнне прэстыжу рабочых спецыяльнасцяў і ўдасканаленне майстэрства ўдзельнікаў. Акрамя прадстаўнікоў «Мінскаўтадар-Цэнтра», у конкурсе ўдзельнічалі кіраўнікі і старшыні прафкамаў арганізацый, якія былі прадстаўлены. Усяго конкурс сабраў 13 камандаў філіялаў «Мінскаўтадара-Цэнтра».

Удзельнікі спаборнічалі ў пяці намінацыях: вадзіцель аўтамабіля «Газель», вадзіцель аўтамабіля «МАЗ», трактарыст, вадзіцель пагрузчыка і ўстройванне пакрыцця з тратуарнай пліткі ў індывідуальным і камандным заліку. Конкурс праходзіў у два этапы. Першы — праверка тэорыі па ахове працы. Гэты этап чымсьці быў падобны да экзамену з білетамі, пытаннямі і адзнакамі. Другі — практычнае прымяненне навыкаў удзельнікаў — своеасаблівы майстар-клас для аўтааматараў-пачаткоўцаў.

У намінацыі вадзіцель аўтамабіля «Газель» пераможцам стаў С. В. Свірыдзюк, супрацоўнік ДЭУ № 5. Найлепшым вадзіцелем аўтамабіля «МАЗ» суддзі прызналі С. І. Баракоўскага з ДЭУ № 5, а найлепшым сярод вадзіцеляў пагрузчыка — В. Н. Бяляева з ДЭУ № 61. У намінацыі «Трактарыст» перамог П. Хамічонак з ДЭУ № 6, а ў намінацыі пакрыццё з тратуарнай пліткі — М. Хахоп з ДЭУ № 6.

А пачатак кастрычніка адзначыўся конкурсам прафесійнага майстэрства сярод работнікаў КУП «Мінскаблдарбуд». Удзельнікі спаборнічалі ў чатырох намінацыях «Найлепшы машыніст аўтагрэйдара», «Найлепшы вадзіцель аўтасамазвала МАЗ-5516 з навясным абсталяваннем», «Найлепшы вадзіцель пагрузчыка» і «Найлепшы машыніст экскаватара». У агульнакамандным заліку перамагла каманда філіяла «ДРБУ-168».

Валерыя СЦЯЦКО. Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНП 805003367